**МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

**Установа адукацыі “Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка”**

Факультэт беларускай і рускай філалогіі

Кафедра беларускага мовазнаўства

**Філіпповіч**

**Марына Васільеўна**

# СТРУКТУРНАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ СКЛАДАНАГА СКАЗА Ў ТВОРАХ ЯНКІ СІПАКОВА

**Дыпломнае даследаванне**

**Навуковы кіраўнік –**

**кандыдат філалагічных навук,**

**дацэнт Мароз С.С.**

**Мінск, 2013**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# РЭЗЮМЭ

Філіпповіч Марыны Васільеўны

# СТРУКТУРНАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ СКЛАДАНАГА СКАЗА Ў ТВОРАХ ЯНКІ СІПАКОВА

**Ключавыя словы:** складаны сказ, прэдыкатыўныя часткі, складаназалежны сказ, складаназлучаны сказ, бяззлучнікавы складаны сказ, складаны сказ камбінаванай будовы, сінтаксічныя адносіны, сродкі сувязі, сінтаксічныя канструкцыі, перыяд, полісіндэтон.

**Аб'ект даследавання –** складаныя сказы ў творах Янкі Сіпакова.

**Мэта работы** – даследаваць асаблівасці структурнай арганізацыі складаных сказаў у творах Янкі Сіпакова.

**Метадалагічнай базаю навуковай работы** сталі артыкулы, вучэбныя дапаможнікі, аўтарэфераты, дысертацыі. Для вырашэння пастаўленых задач выкарыстаны асноўныя прынцыпы апісальнага метаду, часткова супастаўляльнага і метад крытычнага аналізу навуковай літаратуры.

**Навуковая навізна.** Даследаванне складаных сказаў дазваляе выявіць ролю і месца складаных сказаў сярод іншых сінтаксічных адзінак у творах асобных беларускіх пісьменнікаў, таму што гэтая праблема даследавана недастаткова. Непасрэдна проза Янкі Сіпакова дае багаты і змястоўны матэрыял для аналізу структуры складанага сказа.

**Практычная значнасць атрыманых вынікаў.** Усебаковае даследаванне складаных сказаў у прозе Янкі Сіпакова дазваляе выявіць своеасаблівыя сінтаксічныя канструкцыі, якія маюць адметную структурную арганізацыю і функцыянальна-стылістычныя асаблівасці, што вызначае іх спецыфіку і асобае месца ў сінтаксічнай сістэме сучаснай беларускай літаратурнай мове.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ